www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта 19 верасня 2006 года, № 14 (1944)

ПАДЗЕІ

# СПАРТЫЎНЫ КОМПЛЕКС АДКРЫЎСЯ!








***Напярэдадні 85-годдзя БДУ адкрыўся вучэбна-спартыўны комплекс "Універсітэцкі" на вул. Кастрычніцкай.***

15 верасня ў цырымоніі адкрыцця прынялі ўдзел першы намеснік міністра адукацыі Беларусі Аляксандр Жук, рэктар БДУ, прафесар Васіль Стражаў, прарэктары нашай ВНУ, студэнты.

Шлях да гэтай знамянальнай падзеі заняў 5 гадоў. У 2001 г. пачаўся капітальны рамонт і маштабная рэканструкцыя будынку. У чатырохпавярховым корпусе размяшчаюцца 25-метровы басейн з 4- і 5-метровымі вышкамі, некалькі спартыўных залаў (для гульні ў валейбол, баскетбол, гандбол, для розных відаў барацьбы, заняткаў цяжкай атлетыкай, гімнастыкай, лекавай фізкультурай, а таксама — на трэнажорах). Акрамя таго, ёсць аздараўленчы блок з парылкай, утульныя распранальні і душавыя. Упершыню ва універсітэцкай практыцы падлога ў спартыўных залах аформленая спецыяльным прафесійным пакрыццём. За дзень у спарткомплексе змогуць займацца каля 2000 чалавек.

Да пачатку наступнага навучальнага года плануецца здаць яшчэ адзін спартыўны аб'ект — стадыён з футбольным полем. На ім будзе спецыяльнае штучнае пакрыццё. Для гледачоў прадугледжаны трыбуны. На бегавых дарожках і сектарах лёгкай атлетыкі можна ладзіць спаборніцтвы агульнадзяржаўнага ўзроўню — напрыклад, чэмпіянат па футболе сярод жаночых камандаў (пагатоў, што каманда нашага універсітэта "Зорка БДУ" — срэбраны прызёр чэмпіянату Беларусі ў гэтым відзе спорту).

**Настасся ЮДЧЫЦ**
**Фота Юліі ПАПОВАЙ і Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**СМАЧНА ЕСЦІ!**
Пра харчаванне ў БДУ — з першых крыніц
Стар. 2

**ФІЛАЛОГІЯ ЯК СПРАВА ДУШЫ І РОЗУМУ**
Інтэрв'ю з прафесарам Арнольдам МІХНЕВІЧАМ
Стар. 3

**БУДУЧАЕ — ЗА ПЛАСТЫКАВЫМІ СТУДЭНЦКІМІ**
Стар. 4

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

Адбылася сустрэча рэктара БДУ, прафесара Васіля Стражава з прадстаўнічай дэлегацыяй з Турцыі, на якой абмяркоўваліся пытанні супрацоўніцтва ў адукацыйнай сферы. Плануецца, што першая група турэцкіх студэнтаў прыедзе навучацца ў БДУ ўжо ў гэтым годзе.

Урад Беларусі прыняў рашэнне аб адкрыцці 3-га траншу крэдыту на працяг будаўніцтва корпуса ФМА. Паўтара мільёна еўра крэдыту выплачвае ўрад, такую ж суму — БДУ з уласных сродкаў. Акрамя таго, універсітэту яшчэ неабходна ўнесці паўмільёна еўра ў адпаведнасці з падпісанымі БДУ ў 2001 г. умовамі будаўніцтва па крэдыту.

Прадстаўнічая навуковая дэлегацыя з Рэспублікі Карэя 20 верасня наведае БДУ.

У САК «Брыганціна» 22 верасня плануецца ўрачысты пуск сучаснай аўтаматызаванай і камп'ютарызаванай энергазберагальнай сістэмы вытворчасці цяпла. Гэта дазволіць зрабіць умовы адпачынку і творчай працы ў комплексе камфартабельнымі на працягу ўсяго года.

Прынята праграма святкавання 85-годдзя БДУ. На 30 кастрычніка запланаваны ўрачысты сход у ліцэі БДУ, на 31 — навуковая канферэнцыя, дзе будуць уручаны прэміі пераможцам навуковага конкурсу БДУ імя акадэмікаў У.Пічэты і А.Сеўчанкі.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

## ЭЛЕКТРОННЫЯ ПАСВЕДЧАННІ ДЛЯ ВЫКЛАДЧЫКАЎ

***Упершыню ў гісторыі вышэйшай школы нашай краіны ў БДУ ўводзіцца агульная універсальная сістэма электронных персаніфікаваных дакументаў для прафесарска-выкладчыцкага саставу і супрацоўнікаў.***

Мэты нававядзення — забеспячэнне бяспекі і дысцыпліны, а таксама развіццё і ўмацаванне карпаратыўнай культуры. Не выклікае сумневаў, што гэтае нававядзенне стане дадатнай рысай у іміджы нашага універсітэта як сучаснай установы. Першыя 10 новых электронных пасведчанняў атрымалі супрацоўнікі БДУ 18 верасня на пашыраным пасяджэнні Вучонага савета.

Пасведчанні будуць трох відаў — пастаянным супрацоўнікам, для часовага карыстання і гасцявы пропуск.

Плануецца, што турнікеты ва ўсіх навучальных і адміністрацыйных карпусах і інтэрнатах БДУ з'явяцца на працягу бліжэйшых двух гадоў. Акрамя таго, пластыкавыя дакументы спросцяць карыстанне Інтэрнэтам, медыятэкамі і бібліятэчнымі фондамі.

**Падрыхтавала Аліна КРУШЫНСКАЯ**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

## ПЕРАМОЖЦЫ Ў КОНКУРСЕ GOOGLE

Студэнты ФПМІ Аляксандр Казачонак і Дзмітрый Мазоўка сталі пераможцамі сусветнага конкурсу праграмных праектаў студэнтаў, арганізаванага кампаніяй Google (Крэмніевая даліна, Каліфорнія, ЗША).

Узровень шэрага праектаў конкурсу паводле крытэрыяў навізны і значнасці адпавядае патрабаванням, аналагічным тым, што выстаўляюць да доктарскіх дысертацый у ЗША.

Пра свае праекты хлопцы плануюць расказаць на Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Інфарматызацыя навучання матэматыцы і інфарматыцы: педагагічныя аспекты", што пройдзе ў БДУ ў канцы кастрычніка (Аляксандр Казачонак — пра стварэнне самаадаптуемых генератараў тыповых web-дадаткаў, а Дзмітрый Мазоўка — пра генерацыю прыродных з'яў у віртуальнай трохмернай прасторы).

**Ала МАЧАЛАВА**

ВІНШУЕМ!

## РАДЫЁФІЗІКІ АДСВЯТКАВАЛІ ЮБІЛЕЙ

***14—15 верасня факультэт радыёфізікі і электронікі адзначыў сваё 30-годдзе. Другі юбілей, які прыпаў на гэтыя дні, — 45-годдзе падрыхтоўкі радыёфізікаў у нашым універсітэце.***

Гэтай падзеі прысвячалася ўрачыстае пасяджэнне Вучонага савета факультэта 14 верасня, на якое прыйшлі рэктар БДУ, прафесар Васіль Стражаў, дэканы ўсіх факультэтаў і ганаровыя госці — старшыня Дзяржкамітэту па навуцы і тэхналогіях Уладзімір Мацюшкоў, старшыня ВАК Анатоль Афанасьеў, рэктар БДПУ Пётр Кухарчык.

Вечар-сустрэча выпускнікоў факультэта адбыўся 15 верасня. Запрашэнне на яго атрымалі каля паўтары тысячы чалавек. Яны правялі таксама справаздачна-выбарны сход Беларускага рэспубліканскага грамадскага аб'яднання радыёфізікаў.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## ПАСЯДЖЭННЕ ВУЧОНАГА САВЕТА БДУ

Пашыранае пасяджэнне Вучонага савета БДУ на тэму «Вынікі работы Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў 2005—2006 навучальным годзе і задачы на 2006—2007 навучальны год» адбылося 18 верасня ў ліцэі БДУ. Падрабязнасці ў наступным нумары.

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# СМАЧНА ЕСЦІ!

***Харчаванне ў студэнцкім жыцці — справа вельмі важная. Клопат пра тое, дзе і як падсілкавацца, маючы 10—20 хвілін перапынку і рэшткі стыпендыі ў кішэні, можа значна адцягнуць увагу ад навучальнага працэсу. Але толькі не ў тым выпадку, калі вы вучыцеся ў БДУ, дзе арганізацыяй харчавання займаюцца найлепшыя спецыялісты. Сёння ў распараджэнні студэнтаў БДУ знаходзяцца 7 сталовых і 14 буфетаў на 1196 пасадачных месцаў.***

***Пункты грамадскага харчавання БДУ ёсць у чатырох раёнах горада. Часта сюды прыходзяць абедаць не толькі студэнты і супрацоўнікі універсітэта, але і гараджане, бо ведаюць: тут смачная, здаровая і танная ежа.***



***Арганізацыя студэнцкага харчавання, увага да працы камбіната грамадскага харчавання — пастаянны клопат прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце Уладзіміра Васільевіча Рагавіцкага . Ён асабіста кантралюе гэтую сферу, а таксама прыцягвае да работы неабходныя службы універсітэта і пабочныя арганізацыі. Гэта дае свой плён, у чым можна пераканацца, наведаўшы любы пункт харчавання універсітэта.***

**Уладзімір РАГАВІЦКІ:**

## “НА ХАРЧАВАННЕ Ў БДУ НАРАКАННЯЎ НЯМА”



— Якасць харчавання, — сцвярджае Уладзімір Васільевіч, — знаходзіцца пад пастаянным кантролем грамадскіх арганізацый, студэнцкага актыву, кіраўніцтва універсітэта, дзяржаўных органаў, што добра ўплывае на вынікі працы сталовых і буфетаў, таму нараканняў практычна няма. Былі заўвагі арганізацыйнага характару: у прыватнасці, на філфаку скардзіліся, што з-за даўжэзных чэргаў не паспяваюць перакусіць на перапынку, а на юрфаку — што ежы не хапае на ўсіх. Аднак мы аператыўна рэагуем на такія заўвагі, і зараз такіх праблем няма. На філалагічным факультэце дзейнічае другі буфет — прыватны: яны здорава канкурыруюць з нашым, універсітэцкім, а студэнты ад гэтага толькі выйграюць.

Сам прарэктар таксама часта абедае ў нашых сталовых. Уладзімір Васільевіч памятае час, калі на ўвесь універсітэт была адна-адзіная сталовая — у галоўным корпусе: было гэта ў 70-я гады, тады сённяшні прарэктар быў студэнтам.

**Святкаваць дні нараджэння і вяселлі варта ў “Gaudeamus”: для студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта арэнда бясплатная. Відаць, жадаючых і сапраўды шмат, бо яго браніруюць ледзь не за год да свята.**

Кандытарскую прадукцыю пастаўляе ўласны цэх, астатнюю — закупляюць паводле дамоўленасці на розных прадпрыемствах.

Штогод адбываецца касметычны рамонт кожнага памяшкання сістэмы харчавання БДУ згодна з графікам: штосьці рамантуюць паводле загаду санэпідэмстанцыі, астатняе — паводле ўласных планаў.

— Сёлета мы не атрымалі ні адной заўвагі ад санэпідэмстанцыі, усё прайшло бездакорна, — не без гонару кажа прарэктар.

Пагутарылі мы і пра перспектывы гэтай галіны: у спартыўным комплексе на Кастрычніцкай таксама будзе буфет, чакаецца адкрыццё новай сталовай у будучым будынку гуманітарных факультэтаў на Кальварыйскай (на 260 месцаў). А самая аддаленая перспектыва (недзе да 2010 г., але дата гэтая залежыць ад фінансавання) — пабудова сацыяльна-культурнага комплексу ва універсітэцкім двару са сталовай на заходнееўрапейскі ўзор: з аўтаматамі харчавання, зборам посуду і інш. Гэта дазволіць прыбраць сталовыя з факультэтаў, размешчаных ва універсітэцкім гарадку, і зрабіць харчаванне цэнтралізаваным.

**Камбінат грамадскага харчавання БДУ ўключае 7 сталовых, 14 стацыянарных буфетаў (не лічачы пераносных, як, напрыклад, у галоўным корпусе), кандытарскі цэх і кафэ “Gaudeamus” на 100—110 чалавек. Размяшчаюцца пункты харчавання так, каб ва ўсіх навучальных карпусах было дзе падсілкавацца. 2 буфеты (на юрфаку і ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі суддзяў) адкрыліся адносна нядаўна. Варта ўзгадаць і комплекс у Шчамысліцы, дзе ёсць адна з самых лепшых у БДУ сталовых, што забяспечвае харчаваннем буфеты на біялагічным факультэце, факультэце радыёфізікі і электронікі, а таксама НДІ ПФП.**

**Ала МАЧАЛАВА**

***Каб даведацца больш падрабязна пра арганізацыю грамадскага харчавання ў БДУ, мы звярнуліся да дырэктара РВУП “Камбінат грамадскага харчавання БДУ” Юрыя Уладзіміравіча КАНДРУЦКАГА.***

### СТУДЭНТАМ — НАЙСВЯЖЭЙШАЕ

РВУП “Камбінат грамадскага харчавання БДУ” закупляе прадукты не толькі ў дзяржустаноў. І, канечне, шукае найлепшыя прадукты. Напрыклад, садавіну БДУ набывае ў фермерскай гаспадаркі Шруба: высокая якасць робіць садавіну і гародніну з Віцебскай вобласці больш прывабнай, чым прадукцыя мінскіх пладова-гароднінавых камбінатаў.

Свежасць страў, прапанаваных студэнтам, строга кантралюе санстанцыя. Для кожнага прадукту існуе пэўны тэрмін рэалізацыі, таму ўчарашніх булачак ці бутэрбродаў у продажы вы не знойдзеце. Аднак жыццё той жа булкі складае толькі 18 нармаваных гадзін. Што адбываецца з ежай, якую не паспелі прадаць? Яна (па магчымасці) перапрацоўваецца. Напрыклад, нерэалізаваная свежая капуста пройдзе тэрмічную апрацоўку і будзе выкарыстаная для прыгатавання галубцоў. Наконт прадуктаў, якія не падлягаюць перапрацоўцы, існуе дамоўленасць з мікрабіялагічнай лабараторыяй БДУ, дзе гэтай ежай можна карміць вавёрак, мышак і іншых жывёл.

### ЦЭНАВАЯ ПАЛІТЫКА



Фарміруецца паводле інструкцыі Мінгарвыканкама за 1999 г. Ва ўсіх сталоўках і буфетах цэны аднолькавыя. Калі ў адным месцы вам трапляецца катлета “Нясвіж” за 2900 руб., а ў іншым — за 2600 руб., не спяшайцеся скардзіцца дырэктару РВУП “Камбінат грамадскага харчавання БДУ” на несправядлівасць, а паглядзіце на вагу — 125 г і 100 г. Яшчэ адной прычынай розніцы можа быць змена цаны паставак ці выбар іншага пастаўшчыка.

Усе сталовыя і буфеты належаць да трэцяй нацэначнай катэгорыі, самай нізкай з магчымых. Найвышэйшая нацэначная катэгорыя мае 100 % нацэнкі, люкс — 200 %, трэцяя (для рабочых, студэнтаў і школьнікаў) — 40 %. Іншая прычына таннасці ежы ў БДУ — тое, што мяса набываюць па датаваных, а не рынкавых цэнах. Калі кілаграм мяса каштуе пяць тысяч, студэнты атрымліваюць яго за тры.

### ЧЫМ КОРМЯЦЬ

На аснове “Зборніку рэцэптур беларускіх страў” (распрацаванага Асацыяцыяй беларускіх кулінараў у 2002 г.) і “Зборніку рэцэптур страў і кулінарных вырабаў” складаюцца спецыяльныя тэхналагічныя карткі, з якімі працуюць сталовыя і буфеты. У меню павінны ўваходзіць усе стравы, зацверджаныя асартыментным пералікам санітарнай службы раёна. Такі пералік уключае халодныя стравы і закускі, супы, гарачыя стравы, гарніры, гарачыя і халодныя напоі, сокі, кандытарскія вырабы, кісламалочныя прадукты і інш. У гэтым пераліку разнастайнасць ежы студэнтам забяспечваюць прыгаданыя зборнікі, якія з адных толькі яблыкаў прапануюць прыгатаваць каля 50 розных страў. А што ўжо казаць пра бульбу ці мяса?!

### ЧЫМ ХВАЛЯЦЦА

Якасць абсталявання на кухні заўсёды ўплывае на якасць гатовага прадукту. Таму ўсё абсталяванне, напрыклад, у сталоўцы інтэрната № 7 італьянска-нямецкае. Сцены тут упрыгожваюць ганаровыя граматы і дыпломы: толькі ў гэтым годзе сталовая перамагла ў рэспубліканскім аглядзе-конкурсе на найлепшую арганізацыю харчавання навучэнцаў установ, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Сталовая таксама дапамагла БДУ стаць пераможцам гарадскога агляду-конкурсу на найлепшыя аб’екты грамадскага харчавання ВНУ ў намінацыі “Найлепшая сталовая ў студэнцкім інтэрнаце”.

У 2003 г. біялагічны факультэт стаў месцам правядзення міжнароднай біялагічнай алімпіяды. Пакуль нашыя студэнты правяралі свае веды ў біялогіі, сталовая факультэта рыхтавалася да прыёму гасцей з розных краін свету. Па заканчэнні алімпіяды кіраўніцтва Мінадукацыі, універсітэта выказалі асаблівую падзяку РВУП “Камбінат грамадскага харчавання БДУ” за дасканалую арганізацыю харчавання.

Галоўная ж падзяка — здароўе і задаволенасць студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ, што прыходзяць есці ў сталовыя і буфеты свайго універсітэта кожны дзень.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**
**і Дар’і РАСОЛЬКА**



## ПУНКТЫ ХАРЧАВАННЯ БДУ:

**сталовая інтэрната № 5** — вул. Кастрычніцкая, 4а (8.00—18.00, у суботу — да 15.00);
**сталовая інтэрната № 7** — вул. Кастрычніцкая, 10а, (10.00—17.00, у суботу — да 15.00);
**сталовая галоўнага корпуса** — прасп. Незалежнасці, 4 (9.30—17.00);
**сталовая хімічнага корпуса** — вул. Ленінградская, 14 (9.00—17.00);
**сталовая факультэта журналістыкі** — вул. Маскоўская, 15 (8.00—16.00);
**сталовая факультэта радыёфізікі** — вул. Курчатава, 1 (11.00—16.00);
**кафэ рэктарата** — вул. Бабруйская, 5а (9.00—18.00);
**кандытарскі цэх** — вул. Кастрычніцкая, 10а (7.00—15.00);
**буфет** — вул. Бабруйская, 9 (11.00—16.00);
**буфет гістарычнага факультэта** — вул. Чырвонаармейская, 6 (11.00—16.00);
**буфет біялагічнага факультэта** — вул. Курчатава, 10 (11.00—16.00);
**буфет** — вул. К. Маркса, 31 (11.00—16.00);
**буфет геаграфічнага факультэта** — вул. Ленінградская, 16 (11.00—16.00);
**буфет фізічнага факультэта** — вул. Бабруйская, 5 (11.00—16.00);
**буфет ДзІКСТ** — вул. Батанічная, 15 (11.00—16.00);
**буфет факультэта радыёфізікі** — вул. Курчатава, 5 (11.00—16.00);
**буфет НДІ ПФП** — вул. Курчатава, 7 (11.00—16.00);
**буфет** — вул. Маякоўскага, 96 (11.00—16.00);
**кіёск** — прасп. Незалежнасці, 4 (11.00—19.00);
**латок** — прасп. Незалежнасці, 4 (11.00—19.00);
**буфет** — вул. Савецкая, 14 (11.00—19.00);
**буфет юрыдычнага факультэта** — вул. Ленінградская, 8 (11.00—16.00).

УНІВЕРСІТЭТ



## Арнольд МІХНЕВІЧ:

# “КАЛІ ВЫ АБРАЛІ ФІЛАЛОГІЮ ЯК СПРАВУ ДУШЫ І РОЗУМУ, ТО НЕ ПАШКАДУЕЦЕ...”

***9 верасня 2006 г. доктар філалагічных навук, прафесар, акадэмік Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, выдатнік народнай асветы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі Арнольд Яфімавіч МІХНЕВІЧ адзначыў сваё 70-годдзе.***



**— Вы з поспехам працуеце ў розных галінах мовазнаўства. Што кіруе Вамі ў выбары чарговага навуковага напрамку?**

— У маіх навуковых пошуках шмат залежала ад акалічнасцей. Калі працаваў у Інстытуце мовазнаўства, я патрапіў у этымалагічную групу — так прыйшло захапленне этымалогіяй. Потым быў удзел у рабоце Міжнароднай камісіі па вывучэнні граматычнага ладу славянскіх моў з вельмі шырокім складам удзельнікаў. Гэтая праца вельмі пашырала кругагляд. Было відаць, што фактычна ёсць адзін аб’ект даследавання — мова. І з якога б боку вы да яе ні падышлі, вы ўсё роўна поўнасцю гэты феномен не раскрыеце, не пазнаеце. Адсюль і разнастайнасць маіх захапленняў.

**— А тэрміны *нацыялект* і *трасянка* называюць адну і тую ж з’яву?**

— Па-першае, трэба сказаць, што выраз *трасянка* вельмі ўдалы, хоць гэта пабытавае слоўца, але ўсе беларусы ведаюць, што сена з саломай і ёсць трасянка — у гэтым сэнсе вельмі нацыянальнае слоўка. Трасянка ёсць у кожнай мове, бо сама з’ява вельмі пашыраная: гэта адзін са спосабаў кантактавання моў. Трасянка існавала даўно, адно што само слова “не цягне” на тэрмін, бо мае вельмі доўгі побытавы шлейф, “сена-саламяны”, экспрэсіўны. А вось тэрмін *нацыялект* — гэта т.зв. *лект*утварэнні: *дыялект, ідыялект, гендэрлект, сацыялект* і пад. Як назваць рускую мову эстонцаў, рускую мову грузінаў і г.д.? Гэта абсалютна не тое, што трасянка. Гэта можа быць вельмі добрая руская мова, і яна праяўляецца рэгулярна ў многіх асоб: фанетыку грузіна, эстонца я магу апісаць, бо яна мае ўстойлівыя рысы. А трасянка ўвесь час абнаўляецца: адзін скажа так, другі — так. *Нацыялект* — гэта сацыялінгвістычная катэгорыя, якая пазначае ўстойлівыя рысы ў маўленні на чужой мове пад уплывам этнамовы, нацыянальнай мовы. Гэта праблема дзвюхмоўя. А *трасянка* — гэта шкодны вынік дрэннага валодання сваёй, роднай мовай і іншай.

**— Арнольд Яфімавіч, ці будзе ў нас новы правапіс?**

— Новага беларускага правапісу не будзе. Будзе правапіс 1959 года са значнай колькасцю ўдакладненняў і значна абноўлены ілюстрацыйна, выпраўлены. Так, напісанне *-і, -ы* пасля зычных і галосных прыведзена ў адпаведнасць з беларускім фанетычным правілам “пішы, як чуеш”: прапанавана пісаць *педынстытут, звышыдэйны*. З другога боку, трэба ісці за мовай, а не абганяць яе — гэта ў дачыненні да суфікса *—ірава-*: калі з *пасіраваць* атрымліваецца *пасаваць*, то зусім губляецца сэнс. Таму цалкам выкінуць гэты суфікс ніяк не выпадае. Над гэтымі ўдакладненнямі працавала з даўніх часоў група, якой у 90-я гады кіраваў Ніл Гілевіч, потым узначальваў А.І.Падлужны. Зараз падрыхтаваны варыянт, у якім улічаны прапановы і заўвагі, дасланыя ў Інстытут мовазнаўства НАНБ. Было пасяджэнне ў міністра адукацыі, і ён прапанаваў увесці гэты варыянт правапісу Указам Прэзідэнта.

**— Якую б параду Вы далі маладым людзям на дарогу ў краіну “Філалогія”?**

— Калі вы абралі філалогію як справу жыцця, як справу душы, а не толькі зарплаты, то не пашкадуеце, бо гэта бясконцае мора адкрыццяў. Мова паэзіі, семіётыка мовы, значэнне і сэнс, граматыка беларускай мовы, сувязі беларускай мовы з іншымі мовамі, тыя самыя запазычанні, тая самая *трасянка* і дзвюхмоўе, што вы ні возьмеце — вельмі шырокае поле дзейнасці. Я б параіў будучым філолагам перш за ўсё авалодваць іншымі мовамі, а па-другое, чытаць класічныя філалагічныя працы — і айчынныя, і замежныя. Як казаў Якуб Колас, для смелых людзей няма бездарожжа!

**А.Я.Міхневіч — вядомы беларускі лінгвіст, з імем якога ў беларускім мовазнаўстве найперш асацыюецца семантыка-сінтаксічны кірунак даследавання мовы. Ён аўтар амаль 600 публікацый, якія, акрамя сінтаксісу і семантыкі, ахопліваюць іншыя галіны мовазнаўства: этымалогію, рыторыку, русістыку, сацыялінгвістыку, тыпалагічнае мовазнаўства, супастаўляльную лінгвістыку, лексікаграфію, лінгвадыдактыку і інш. Ён рэдактар і адзін з аўтараў энцыклапедыі “Беларуская мова”, раздзела “Беларуская мова” ў маскоўскай энцыклапедыі “Мовы свету: Славянскія мовы” ды інш. Пад яго кіраўніцтвам абараніліся 15 аспірантаў і 3 дактары навук.**

**Матэрыял падрыхтавала Таццяна РАМЗА, дацэнт кафедры сучаснай беларускай мовы**
**Фота Юліі ПАПОВАЙ**

**Поўны варыянт інтэрв’ю чытайце на сайце МАБ (http://mab.org.by)**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# НОВЫЯ ПРАЕКТЫ З КІТАЕМ

***Сумесны цэнтр навуковых даследаванняў Беларускага дзяржаўнага універсітэта і Хэйлунцзянскага інстытута нафтахіміі адкрыўся ў Харбіне (КНР). Цырымонія прайшла падчас наведвання Кітая дэлегацыяй БДУ на чале з першым прарэктарам Сяргеем Рахманавым.***

Асноўнай мэтай візіту быў удзел у Міжнародным кірмашы патэнтаў і тэхналогій у горадзе Далян (17—19 жніўня) і Міжнароднай выставе навукова-тэхнічных дасягненняў у Харбіне (21—24 жніўня). На гэтых маштабных мерапрыемствах БДУ паказаў распрацоўкі ў галіне хіміі (новыя хімічныя рэчывы, матэрыялы і тэхналогіі), фізікі (віртуальныя вымярэнчыя сістэмы, прылады, устаноўкі і ЗВЧ-тэхналогіі), а таксама адукацыйныя паслугі.

Прайшлі перамовы пра стварэнне сумесных прадпрыемстваў і набыццё кітайскім бокам тэхналогій і абсталявання. Па выніках дзелавых сустрэчаў падпісаныя 10 дакументаў з пацвярджэннем гэтых намераў. Асаблівы інтарэс выклікалі тэхналогіі вытворчасці і прымянення вырабаў з пенаполіурэтанаў, антыкаразійных саставаў, біялагічных сродкаў абароны сельскагаспадарчых раслінаў, вытворчасці дызельнага біяпаліва з расліннай сыравіны. Дэлегацыя БДУ сустрэлася з прадстаўнікамі партыйных і дзяржаўных органаў кіравання правінцый Ляанін і Хэйлунцзян, гарадоў Далян і Харбін. Яны адзначалі вельмі высокі ўзровень навуковых распрацовак нашага універсітэта. Дарэчы, для сустрэчы і перамоваў з гасцямі з БДУ ў Харбін прыехалі прадстаўнікі Дэпартамента навукі і тэхналогій правінцыі Чжэцзян (г. Ханчжоў) і Акіянаграфічнага інстытута г.Чжоўшань, пераадолеўшы адлегласць у некалькі тысячаў кіламетраў. Акрамя таго, генеральны дырэктар Кітайска-расійскага тэхнапарку зладзіў наведванне тэхнапарку ў г. Чанчуні (правінцыя Цзілін) і прапанаваў стварыць пры тэхнапарку беларускае аддзяленне. Частку фінансавых выдаткаў кітайскі бок можа ўзяць на сябе.

Дэлегацыя БДУ таксама дамовілася з кіраўніцтвам Далянскага політэхнічнага універсітэта падрыхтаваць поўнамаштабнае пагадненне аб супрацоўніцтве дзвюх ВНУ ў галіне адукацыі і навукі.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**
**падрыхтавала Дар’я РАСОЛЬКА**

# БДУ ў СМІ Беларусі

Напрыканцы лета і на пачатку навучальнага года ў беларускіх СМІ і на інфармацыйных Інтэрнэт-сайтах асвятляліся наступныя падзеі, звязаныя з Белдзяржуніверсітэтам:

**“Комсомольская правда” (22.08)** — “Где жить первокурснику?”; **“Минский курьер” (31.08)** — “Двоечникам и дебоширам общежитие не светит”; **“Звязда”(7.09)** — “Студэнты здымаюць шматпакаёўкі”: умовы засялення студэнтаў у інтэрнаты БДУ, а таксама дакладны пералік магчымых ільготаў.

**“Звязда” (25.08)** — “І педагогі, і цесляры”; “Працаваў? Атрымай месца ў інтэрнаце...”; **“Рэспубліка” (25.08)** — “Студенты строили и учили”; **“Знамя юности” (8.09)** — “Окно в Европу”: артыкулы пра ўдзел студэнтаў БДУ ў праграме “Лета — 2006”.

**“Вечерний Минск” (29.08)** — “Гісторыка”, или Машину времени собрали на истфаке”: пра тое, чым займаюцца студэнты гістфака ў аб’яднанні “Гісторыка”.

**“Звязда” (02.09)** — “Белдзяржуніверсітэту — 85!”; **“Вечерний Минск” (04.09)** — “... И парад деканов”; **“Рэспубліка” (31.09)** — “И молебен в честь начала учебного года”: матэрыялы пра тое, як у БДУ прайшоў Дзень ведаў.

**“Народная газета” (07.09)** — “Найти иголку в стоге сайтов”: інтэрв’ю, якое даў выпускнік факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ Ігар Маханек — сёлета ён стаў пераможцам міжнароднага конкурсу па пошуку ў Інтэрнэце.

**www.news.by (07.09)** — “БГУ — не хуже Гарварда!”: Інтэрнэт-канферэнцыя з прарэктарам БДУ па адукацыйных інавацыях і інфармацыйных тэхналогіях, дэканам факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Паўлам Алексеевічам Мандрыкам, дзе ён паведаміў пра распрацоўкі, якія вядуцца для ўдасканалення навучальнага працэсу ў БДУ, а таксама адказаў на пытанні студэнтаў і іх бацькоў.

**“Минский курьер” (01.09)** — “Станьте в круг”: пра ўдзел студэнцкіх тэатраў БДУ ў мерапрыемствах, звязаных са святкаваннем Дня горада.

**“Настаўніцкая газета” (12.09)** — “Беларусь—Китай”; **“Рэспубліка” (08.09)** — “В Харбине открылся совместный научный центр”: пра абмен інфармацыяй і канкрэтныя праекты паміж БДУ і арганізацый Кітая.

**БелаПАН (14.09)** — “Факультет радиофизики и электроники БГУ отмечает свое 30-летие”; **www.studenty.by (14.09)** — “Сёння 31 год факультэту радыёфізікі БДУ”; tut.by — “Факультет радиофизики и электроники БГУ отмечает свое 30-летие”: пра юбілей ФРФіЭ Белдзяржуніверсітэта.

**“Советская Белоруссия” (14.09)** — “Студенты БГУ стали победителями 2-го всемирного конкурса программных проектов Google”; **“Звязда” (14.09)** — “Беларускія праграмісты прадэманстравалі вышэйшы пілатаж”; **“Рэспубліка” (14.09)** — “Лучшие среди среди студентов мира”; **БДГ—on-line (14.09)** “Студенты БГУ — победители конкурса программных проектов”; **БелаПАН (13.09)** — “Студенты БГУ стали победителями всемирного конкурса программных проектов Google”: пра перамогу студэнтаў ФПМІ БДУ на конкурсе праграмных праектаў Google

**“Советская Белоруссия” (14.09)** — “Системный анализ будущего”: пра вынікі ўступнай кампаніі.

Пра гэтыя і іншыя падзеі ў БДУ шырока паведамлялі ў сваіх матэрыялах інфармацыйныя агенцтвы БЕЛТА, БелаПАН, ІНТЭРФАКС, АТН, тэлеканалы ЛАД, БТ, СТВ, АНТ, Беларускае радыё і FM-станцыі.

**По матэрыялах прэс-службы БДУ**
**агляд падрыхтавала Дар’я РАСОЛЬКА**

КАНФЕРЭНЦЫІ

# ДА ЮБІЛЕЮ МАТЭМАТЫКА

У алімпійскім спартыўным комплексе “Стайкі” праходзіць Міжнародная навуковая канферэнцыя “Аналітычныя метады аналізу і дыферэнцыяльных раўнанняў” (13—19 верасня). Яна прысвячаецца 100-годдзю з дня нараджэння вядомага матэматыка, акадэміка Фёдара Гахава (1906—1980). Арганізатарамі форуму выступілі механіка-матэматычны факультэт БДУ, Інстытут матэматыкі НАН Беларусі і Маскоўскі дзяржаўны універсітэт. У рабоце канферэнцыі прымаюць удзел каля 250 навукоўцаў і спецыялістаў у галіне матэматыкі, механікі і фізікі з 20 краінаў свету.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

АБ’ЯВЫ

## ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ “РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ”

**запрашае на павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку выкладчыкаў і спецыялістаў устаноў адукацыі па наступных напрамках:**

1. Вялікая Айчынная вайна ў кантэксце ваенна-палітычнай гісторыі Беларусі (для выкладчыкаў) — **02.10—14.10;**
2. Сістэма кантролю якасці ва ўстановах вышэйшай адукацыі (для выкладчыкаў ВНУ) — **02.10—07.10;**
3. Кіраванне адукацыйнымі ўстановамі ва ўмовах сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь (для дэканаў, рэзерву дэканаў, намеснікаў дэканаў факультэтаў) — **09.10—14.10;**
4. Філасофска-метадалагічная культура маладых навуковых работнікаў і выкладчыкаў (для выкладчыкаў ВНУ) — **09.10—21.10;**
5. Студэнцкая моладзь і здаровы лад жыцця (для куратараў студэнцкіх груп, спецыялістаў па сацыяльнай і выхаваўчай рабоце) — **16.10—20.10 і 27.11—01.12;**

**Перападрыхтоўка з прысваеннем кваліфікацыі:**

6. Псіхолаг. Выкладчык псіхалогіі (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, ПТВ, СШ і інш.) — **02.10.06—29.03.08** (вочна, па этапах);
7. Культуролаг. Выкладчык культуралагічных дысцыплін (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, ПТВ, СШ і інш.) — **13.11.06—15.05.08** (вочна, па этапах).

**Калі Вас зацікавіла наша інфармацыя і Вы гатовы прыняць удзел у курсах, тэлефануйце па №№ 222-83-03, 200-20-47 *для папярэдняга запісу ў групы.***

**Наш адрас: 220007, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, каб. 319, тэл./факс 200-25-51.**

## ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ “РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ”

арганізуе для ўсіх ахвотных шматузроўневыя курсы англійскай мовы. Групы — ад 5 да 10 чалавек. Ствараюцца групы вечаровыя і выхаднога дня.

**Тэлефон для даведак 256-08-40.**

## УСТАНОВА БДУ “НАЦЫЯНАЛЬНЫ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ЦЭНТР ПРЫКЛАДНЫХ ПРАБЛЕМ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ”

**аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных вакантных пасад:**

— старшы навуковы супрацоўнік НДЛ праблем бяспекі інфармацыйных тэхналогій (2).

**Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб’явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 4, пакой 337, ННДЦ прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі, тэл. 209-50-42.**

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

## ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

*Н.А. Мельникова.* **Бюджетная и налоговая системы Республики Беларусь.** У вучэбным дапаможніку выкладаюцца тэарэтычныя і метадалагічныя асновы ўзнікнення і развіцця бюджэту дзяржавы.

*А.С. Рубис.* **Деятельность прокуратуры в борьбе с преступностью (на этапе выявления преступлений).** У манаграфіі разглядаецца дзейнасць пракуратуры па арганізацыі і каардынацыі барацьбы са злачыннасцю на этапе выяўлення злачынстваў.

*А.У. Вострыкава.* **Сучасная чэшская літаратура: вернутыя імёны.** У курсе лекцый змяшчаюцца матэрыялы па чэшскай літаратуры апошніх дзесяцігоддзяў, даецца характарыстыка асноўных тэндэнцый развіцця, мастацкіх пошукаў, літаратурнай сітуацыі ў сучаснай Чэхіі.

*В.И. Яшкин.* **Численные методы в химии. Математическое моделирование.** У практыкуме разглядаюцца метады пабудовы і лікавага рашэння матэматычных мадэляў хімічных працэсаў з дапамогай сістэм камп'ютарнай матэматыкі і электронных табліц.

**Выделение и анализ липидов.** У лабараторным практыкуме выкладаюцца абагульненыя звесткі па класіфікацыю, структуру, функцыі і некаторыя агульныя ўласцівасці ліпідаў.

*Ю.В. Пономаренко.* **Правовая информатика.** Практыкум прызначаны для арганізацыі і правядзення практычных заняткаў і самастойнай работы студэнтаў па курсе "Прававая інфарматыка".

*М.А. Воробьев, Н.И. Громко, В.С. Мастяница.* **Основы информатики.** Практыкум прызначаецца студэнтам эканамічных спецыяльнасцей для вывучэння дысцыпліны "Асновы інфарматыкі і праграміравання".

*А.И. Береснева.* **Анализ хозяйственной деятельности.** У практыкуме даюцца асноўныя заданні па комплексным аналізе гаспадарчай дзейнасці.

*С.В. Буга.* **Информационные технологии в работе с текстом.** Практыкум для магістрантаў дае практычныя рэкамендацыі і практыкаванні для засваення сучасных інфармацыйных тэхналогій.

**Сборник учебных программ по естественнонаучным дисциплинам.** Зборнік уключае праграмы па хіміі, фізіцы, вышэйшай матэматыцы, інфарматыцы і энергазберажэнні для студэнтаў біялагічнага факультэта.

**Задания для чтения оригинальных текстов на французском языке. В 2 частях. Ч. 2.** Студэнтам прапануюцца арыгінальныя тэксты, у якіх разглядаюцца асноўныя кірункі філасофскай думкі XVIII—XX ст.

**Современный русский язык: Практикум по орфографии.** У вучэбным дапаможніку з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь прапануецца сістэма эфектыўных практыкаванняў па ўсіх раздзелах рускай арфаграфіі.

*Л.А. Жадобина.* **Общий уход за больными.** Праграма змяшчае планы правядзення лекцыйных і практычных заняткаў па курсе "Агульны догляд хворых".

*Р.А. Желдакова.* **Механизмы биосинтеза антибиотиков и их действие на клетки микроорганизмов.** Вучэбнаметадычны комплекс разглядае асноўныя прынцыпы выдзялення прадуцэнтаў антыбіятычных рэчываў, умовы іх біясінтэзу і дзеянне на клеткі мікраарганізмаў, фарміраванне механізмаў рэзістэнтнасці да антыбіётыкаў.

**Лістападаўскія сустрэчы-5: праблемы старажытнасці і сярэднявечча.** У зборнік увайшлі артыкулы, напісаныя паводле матэрыялаў дакладаў навуковых супрацоўнікаў, выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў ВНУ Беларусі, Расіі, Украіны на Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай выдатным беларускім гісторыкам М.М. Нікольскаму і У.М. Перцаву.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы**

ПОСТФАКТУМ

## І УНІВЕРСІТЭЦКАЯ КНІГА СВЯТКАВАЛА!

***3 верасня ў Паставах на Віцебшчыне адбылося ўрачыстае свята Яе Вялікасці Кнігі — Дзень беларускага пісьменства. У Паставы прыбыло больш за 10 тысяч удзельнікаў свята і гасцей з Масквы, Літвы, Латвіі, Украіны, В'етнама, Балгарыі, Сербіі, Казахстана, Індыі, Малдовы, а таксама з усіх куткоў Беларусі.***




Удзел ва ўрачыстасцях прынялі прадстаўнікі ўлады, духавенства, выдаўцы, навукоўцы, пісьменнікі, журналісты, студэнты і школьнікі, артысты. Універсітэцкую кнігу на свяце прадставілі Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ і РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ".

Кнігі выдавецтва (а гэта курсы лекцый, вучэбныя дапаможнікі, падручнікі, вучэбна-метадычныя комплексы, даведнікі і манаграфіі) былі размешчаны ў экспазіцыі тэматычнай пляцоўкі "Шлях да ведаў", а таксама павільёна "Кнігі Беларусі: сучасны стан" і мелі вялікі поспех у наведвальнікаў.



З вялікім уздымам прайшлі прэзентацыі новых кніг, а таксама віктарына "Мой універсітэт". Каштоўнай аздобай свята пісьменства, яркай асаблівай яго фарбай, было выступленне народнага ансамбля БДУ "Тутэйшая шляхта".

У наступным годзе Дзень беларускага пісьменства будзе адзначацца ўжо ў старажытным Шклове.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ**

НАВУКОВЫ ІНТАРЭС

## ЛЕТНЯЯ ШКОЛА Ў ШВЕЦЫІ

БДУ актыўна супрацоўнічае з замежнымі ВНУ, у тым ліку і з шведскім Упсала. Ужо не першы год прадстаўнікі нашага універсітэта наведваюць Швецыю. Сёлета студэнты і аспіранты геаграфічнага і біялагічнага факультэтаў пад кіраўніцтвам прафесара Галіны Марцынкевіч прынялі ўдзел у працы летняй школы на палявой станцыі Нор Мальма. Беларусаў сюды запрасіў дырэктар — Курт Петэрсан. Яго вельмі ўразіла цікаўнасць і дасціпнасць беларускай групы і яе кіраўніка, пра што ён паведаміў у лісце рэктару. Курт Петэрсан таксама выказаў надзею на далейшае супрацоўніцтва.



З просьбай расказаць пра летнюю школу ў Швецыі мы звярнуліся да Галіны Іосіфаўны Марцынкевіч, прафесара кафедры геаэкалогіі геаграфічнага факультэта БДУ, доктара геаграфічных навук, і вось што ад яе пачулі:

— 12 студэнтаў і 2 аспіранты БДУ на працягу 11 дзён працавалі над тэмай "Уздзеянне змянення клімату на стан вадазбораў і водных экасістэм". Заняткі праходзілі ў форме лекцый, семінараў па матэматычным мадэляванні, нашы біёлагі і географы рыхтавалі і дэманстравалі ўласныя прэзентацыі. На лекцыях, якія чыталі выкладчыкі універсітэта Упсала і даследчыкі стакгольмскага цэнтра па вывучэнні водных рэсурсаў, ішла размова аб прычынах глабальнага пацяплення. Шведскія вучоныя лічаць гэта вынікам не толькі дзейнасці чалавека, але і эвалюцыйнага развіцця прыродных працэсаў.

Беларусы таксама засвоілі асновы мадэлявання кліматычных працэсаў, падрабязна вывучылі Глабальную мадэль воднага баланасу вадазбора, на аснове якой функцыянуе водная сістэма ў наваколлі Нью-Йорка. Дзякуючы гэтай мадэлі і шэрагу субмадэляў, з якімі таксама пазнаёміліся ўдзельнікі летняй школы, можна даследаваць якасць вады, распрацоўку спосабаў яе паляпшэння і кіравання воднымі рэсурсамі. Аднак самае цікавае, што беларускія студэнты і аспіранты выкарысталі гэту мадэль для даследавання возера Нарач.

— З вынікамі навучання ў летняй школе ў Швецыі абавязкова будуць азнаёмлены студэнты і выкладчыкі нашага факультэта, — запэўнівае Галіна Іосіфаўна. — Пройдзе гэта ў выглядзе прэзентацыі ў пачатку новага навучальнага года.

**Ала МАЧАЛАВА**

АКТУАЛЬНА

## БУДУЧАЕ — ЗА ПЛАСТЫКАВЫМІ СТУДЭНЦКІМІ

***Мы дачакаліся таго часу, калі пластыкавы студэнцкі стаў шматфункцыянальным: з наступнага месяца гэты дакумент будзе абавязковым для жадаючых зайсці ў інтэрнаты № 2 і № 6, а таксама на хімфак і факультэт радыёфізікі і электронікі (што тлумачыцца наяўнасцю там каштоўнага абсталявання, а на хімічным факультэце — ядаў і рэактываў, а ніяк не спробай кантраляваць наведванні студэнтаў, як непакояцца многія). Каб у вас не было сумненняў на гэты конт, адзначаем: за 15 хвілін да пачатку заняткаў сістэмы плануюць адключаць і рабіць уваход вольным, а вось прайсці ў карпусы пасля заняткаў, у вечаровы час без фіксацыі будзе немагчыма.***

**Пра новаўвядзенні мы пагутарылі з Юрыем Іосіфавічам ВАРАТНІЦКІМ, дырэктарам Цэнтра інфармацыйных тэхналогій БДУ:**

— Змены ў прапускной сістэме інтэрнатаў спрасцяць уваход тым студэнтам, што не пражываюць там: не трэба пакідаць дакументы ў дзяжурнага і выходзіць таму, хто сустракае, як гэта было раней. Камп'ютарызаваная прапускная сістэма таксама будзе ўстаноўлена ў рэктараце і адміністрацыйным будынку на Бабруйскай, 9. У перспектыве такія змены чакаюць усе карпусы універсітэта. Гасцям і наведвальнікам універсітэта будзем выдаваць часовыя прапускі.

Зменіцца і сістэма абслугоўвання чытачоў у бібліятэцы: электронны чытацкі фармуляр удалося сумясціць з электронным каталогам, для гэтага таксама спатрэбіцца пластыкавы студэнцкі, такі ж сродак доступу і ў медыятэках. У хуткім часе на юрфаку з'явіцца першы інфакіёск, з дапамогай якога можна будзе праверыць электронную пошту, запісацца на прыём да кіраўніцтва універсітэта, адправіць сваё пытанне, выказаць прапанову. Пластыкавы студэнцкі білет будзе каштаваць 16.600 рублёў. Мяняць яго трэба штогод, бо білет не толькі ідэнтыфікуе асобу студэнта, але і дае яму пэўныя правы, напрыклад, магчымасць атрымліваць ільготы ў транспарце. Ёсць два шляхі пазбаўлення такіх дакументаў, і абодва нам не падыходзяць: першы — абсталяваць усе ўстановы счытвальнымі прыстасаваннямі (гэта нерэальна), другі — наклейваць маркі, якія падаўжаюць тэрмін дзеяння білета, (такім спосабам карысталіся ва Украіне), але ж маркі можна падрабляць, пераклейваць і г.д. Таму самы аптымальны варыянт — замена студэнцкага.

**Згодна з пунктам 9 загаду рэктара "Аб выкарыстанні ў 2006/2007 навучальным годзе пластыкавых студэнцкіх білетаў і заліковых кніжак з персаніфікаваным пакрыццём" вызваляюцца ад аплаты за студэнцкі білет (за выключэннем выдачы ўзамен страчаных) студэнты-сіроты і інваліды І, ІІ і ІІІ груп, студэнты з ліку дзяцей-інвалідаў ІІІ і IV ступені страты здароўя паводле спісаў, якія прадастаўляе прафкам студэнтаў БДУ.**

16.600 — сума не малая, аднак за мінулы год на камп'ютарызацыю навучальнага працэсу ў БДУ было выдаткавана каля 2 мільярдаў рублёў. Кардонныя студэнцкія ў гэтым годзе не падаўжаюць: усе яны будуць замяняцца пластыкавымі. Не забывайцеся, што толькі з дапамогай пластыкавых білетаў вы атрымаеце бясплатны выхад у Інтэрнэт у выглядзе 2 гігабайтаў знешняга трафіку кожны месяц, а ў перспектыве — магчымасць доступу з уласных камп'ютараў у начны час.

**Ала МАЧАЛАВА**

## З УСМЕШКАЙ

***

У студэнцкай сталовай:
— Мне тры другіх.
— А корань з мінус двух не хочаш?

***

Студэнт у сталовай робіць заказ:
— Дзве сасіскі.
Повар:
— О, шыкуеш!
— І шаснаццаць відэльцаў...

***

Дзень стыпендыі — дзейнічае "правіла правай рукі": студэнт прыходзіць у сталовую, правай рукой закрывае цэны на меню, выбірае назвы страваў, купляе і есць.

Тыдзень пасля стыпендыі — дзейнічае "правіла левай рукі": студэнт прыходзіць у сталовую, левай рукой закрывае назвы страваў, выбірае зручныя цэны, купляе стравы і есць.

Тыдзень да стыпендыі — дзейнічае "правіла свярдзёлка": студэнт прыходзіць у сталовую, круціцца-круціцца на адным месцы і сыходзіць...

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты — Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

19 верасня 2006 года
Падпісана да друку 18.09.2006 г.
Зак. 838 . Тыраж 1000 экз.Ум. друк. арк 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праспр. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7,
пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by